www.nv-online.info

№ 1 (3844)

3 студзеня 2014 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай
і рускай мовах

Выдавец: УП «Народная Воля».
Кошт — свабодны.

Народная Воля

На прастор, на шырокі разлог
Выходзі, мой народ, грамадою...

Якуб КОЛАС

Да ўвагі!
Хто хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

Дзякуй усім, хто падпісаўся на "Народную Волю" на першую палову 2014 года, а таксама тым, хто набывае газету ў шапіках.
З Новым годам Вас! Моцнага здароўя, плёну ў працы, радасных дзён!

Рэдакцыя газеты "Народная Воля".

АД ДУШЫ

Разам!



Добры дзень, "Народная Воля"!

Ужо некалькі год, як ты стала для мяне роднай, інакш кажучы — раднёй. Па ўзросце ты мне ўнучка. Ты расла на маіх вачах, вучылася пераадольваць цяжкасці жыцця, нават змагацца з нядобразычліўцамі, а бывала, і з нелюдзямі за праўду, за сваё існаванне, за незалежнасць, за Волю. Сёння ты ўжо дарослая, адукаваная, па характары справядлівая, разважлівая, не па ўзросце мудрая, прывабная і вельмі жаданая многімі асобамі. Я з нецярпеннем чакаю твайго прыходу ў маю хату. Мы садзімся за стол, і ты з захапленнем праўдзіва расказваеш мне пра ўсе падзеі, якія адбываюцца ў жыцці маёй Беларусі. Ты мудра разважаеш аб сённяшніх праблемах. Ты прывіваеш мне пачуццё гонару і за Радзіму, і за тое, што я — беларус.

Але ж бывае і так, што я спрачаюся з табой, не згодны з тымі высновамі, якія ты робіш, ацэньваючы тую ці іншую жыццёвую сітуацыю. І гэта добра. Ісціна нараджаецца ў спрэчках.

Ты расказваеш мне пра маю родную мову і неаднойчы ўжо прызнавала, што мала ў яе прыхільнікаў і ты вымушана час ад часу весці гаворку на чужой мове. Я не крыўдую на цябе за гэта. Што ж тут зробіш — так склаўся лёс. Не ты ў тым вінаватая. Адзін мудрэц сказаў, што чалавецтва ў масе сваёй ніколі не будзе імкнуцца бачыць рэчы такімі, якія яны ёсць. Вось і нашы з табой землякі не бачаць свайго, беларускага, ва ўласным побыце, культуры, гістарычным мінулым, шмат што прыпісваючы іншаму народу. Яны вельмі памыляюцца, адмаўляючыся ад шматвяковай гісторыі сваіх продкаў, ад беларускасці. Яны здраджваюць продкам — і ў гэтым іх вялікі грэх. Разам з табою я буду спадзявацца, што калі-небудзь да іх прыйдзе прасвятленне. Вось толькі каб яно не спазнілася: краіна можа стаць іншай...

Я перажываю за яе і хвалююся за цябе. Што будзе з табою, родная, у новым годзе? Колькі ты збярэш сваіх прыхільнікаў, заступнікаў? Як і чым я магу табе дапамагчы?

У цябе цудоўная сям'я — твае супрацоўнікі. Ты называеш іх прозвішчы, і я дзякую ім за прафесіяналізм, за сумленнасць, шчырасць, людскасць. Я зычу ім не страчваць аптымізму, заставацца прынцыповымі, праўдзівымі, смелымі. Жадаю кожнаму з іх асабістага шчасця, дабрабыту, утульнасці і цеплыні ў хатах і кватэрах, творчых поспехаў, прафесійнай удачы. А табе, родная "Воля", жадаю заставацца такой жа цікавай, па-жаночы прыгожай і маладой. Я зноў буду чакаць цябе ў сваёй хаце ўвесь 2014 год.

З Новым годам, "Народная Воля"!

З мужным сэрцам і без страху — насустрач будучыні! Разам!

З любоўю і павагай —

Міхась СПІРЫДОВІЧ.

г.п.Івянец.

АД РЭДАКЦЫІ

Шчыра кажучы, не чакалі мы такога шчымліва цёплага, можна сказаць, сонечнага ліста. Вось дык навагодні падарунак!

Дзякуй, шаноўны Міхась Спірыдовіч! Сапраўды, будзем РАЗАМ!

У тэму, здаецца, і дзве цытаты, якія таксама вымушаюць сур'ёзна задумацца.

Екатерина II, 1796 год

"...Великое Княжество Литовское впредь именовать только Белой Русью, а народ ее белорусами, чем на века привяжем ее к России. Замирить Белую Русь силой невозможно. Эту миссию мы возложим на русского чиновника, русского учителя, русского попа. Именно они отнимут у белорусов не только их язык, но и саму память про самих себя".

Расул ГАМЗАТОВ

И если вдруг исчезнет завтра мой язык,
Я готов сегодня умереть.

СА СВЯТАМ!

Хрыстос нарадзіўся!



Узлюбленыя архіпастыры, пастыры, манахі і ўсе верныя дзеці Беларускай Праваслаўнай Царквы!

Хрыстос нарадзіўся! — Бог уцялесніўся!

Вітаю вас гэтым святочным воклічам, у якім мы выказваем нашу радасць сустрэчы з Богам і надзею на перамяненне ўсяго нашага жыцця ў Хрысце!

Бог — гэта любоў. Магчыма, гэта самыя каштоўныя словы Святога Евангелля. Праз іх мы пазнаём пра адносіны Бога Айца, Сына і Святога Духа, а таксама і пра тое, што гэтая спрадвечная любоў неабыякавая да нас, людзей, якія жывуць на зямлі.

Кожны з нас укладае ў паняцце "любоў" свой сэнс. Ёсць сярод нас і тыя, каго жыццёвыя абставіны паставілі на мяжу расчаравання ў гэтым высокім пачуцці.

Але вось сёння ў яслях перад намі ляжыць Богадзіця Хрыстос. Услед за евангелістам Іаанам нашы здзіўленыя сэрцы шэпчуць: І Слова стала плоццю, і жыло сярод нас, поўнае благадаці і ісціны.

Гэтае здзіўленне нараджае ўзнёслае славаслоўе: Слава ў вышніх Богу, і на зямлі мір, у людзях добрая воля! Гасподзь, Які дзве тысячы гадоў таму змясціўся ў Віфлеемскіх яслях, цяпер нараджаецца ў нашых сэрцах. І тады ўслед за здзіўленнем і захапленнем да нас сыходзіць упэўненасць у тым, што любоў існуе, таму што вось Ён, уцялеснены Бог, вось яна перад намі, любоў, пра якую апостал Павел кажа: сукупнасць дасканаласці. Яна старэйшая і глыбейшая за нашы пераменлівыя пачуцці. Яна бачыць і ведае нашы слабасці і нашу сілу, нашы грахі і імкненне да святасці. Любоў доўгацярплівая, міласэрная, любоў не зайздросціць, любоў не ўзвышае сябе, не ганарыцца, — кажа апостал Павел. І далей ён працягвае сваё ўзвышанае сведчанне: яна не радуецца няпраўдзе, а радуецца ісціне; усё пакрывае, усяму верыць, на ўсё спадзяецца, усё пераносіць. Любоў ніколі не перастае.

Гімн любові, заспяваны некалі апосталам Паўлам, дагэтуль гучыць у Царкве. У ёй, як і ў яе Заснавальніку, Іісусе Хрысце, злучаны два пачаткі: Божы і чалавечы. Мы прыносім у Царкву чалавечыя чаканні, боль і надзеі. І ў той меры, у якой гэтае прынашэнне здзяйсняецца з верай, ад усёй душы, Гасподзь напаўняе нас Сваёй любоўю, Самім Сабой.

Узлюбленыя браты і сёстры! Сёння мы святкуем Раджджаство Хрыстова, святое Богаўцялесненне. Яно здзейснілася дзеля нас з вамі. Каб мы змянілі смутак на радасць.

Зазірнём унутр уласнай душы. Ацэнім свае думкі, пачуцці, усе свае схільнасці перад абліччам Вечнага Жыцця, яўленага сёння ў Богадзіцяці. Калі мы ўгледзімся ў евангельскія падзеі, то ўбачым, што ў Віфлеем з розных бакоў імкнуцца людзі. З аднаго боку, гэта вешчуны і пастухі, паслухмяныя волі Божай. З іншага боку, гэта пасланнікі Ірада, які вырашыў знішчыць Віфлеемскіх немаўлят. Прастата і мудрасць адных. Страх і прагнасць другіх.

Памышленні нашага розуму, падобна да людзей, апісаных у Евангеллі, раздзяляюцца перад абліччам Божым. Здолеем жа ў гэтыя святочныя дні ўстаць на бок мудрасці і прастаты. Прымірымся з бліжнімі, адкінем грахоўныя звычкі, адступім хоць бы на час ад жыццёвай мітусні, каб азарыцца святлом Віфлеемскай зоркі і сагрэцца дыханнем уцялесненага Бога.

У надыходзячым годзе мы будзем святкаваць 700-годдзе з дня нараджэння вялікага ўгодніка Божага — прападобнага Сергія Раданежскага. Заснаваўшы манаскую абіцель у імя Прасвятой Троіцы, ён усю зямлю Святой Русі прысвяціў Ёй. Спрадвечная любоў Айца, Сына і Святога Духа стала дзейснай сілай, якая праз духоўныя намаганні прападобнага Сергія ацаляла душы суайчыннікаў.

У 2014 годзе Беларуская Праваслаўная Царква будзе ўрачыста адзначаць 30-годдзе ўстанаўлення Сабору Беларускіх святых. Нашы святыя на працягу ўжо многіх стагоддзяў яўляюць нам узор духоўнага ўзыходжання, да якога пакліканы і кожны з нас: абнавіцца духам і апрануцца ў новага чалавека, створанага па Богу, у праведнасці і святасці ісціны.

Сёння мы маем патрэбу ў героях веры і любові, героях паўсядзённага хрысціянскага жыцця. Мы маем патрэбу ў тым, каб яслі нашых сэрцаў, нашы дамы і працоўныя месцы асвяціліся святлом Каляднай зоркі, што абвяшчае сілу любові. Будзем памятаць словы апостала Іаана Багаслова: хто знаходзіцца ў любові, той знаходзіцца ў Богу, і Бог у ім.

Калядны перыяд — гэта заўсёды добрая нагода для выказвання шчырых сямейных пачуццяў. Дай Божа, дарагія браты і сёстры, каб мы сталі ў гэтыя дні дабрэйшымі адзін да аднаго.

Вітаю ў гэтыя дні братоў і сясцёр, якія знаходзяцца цяпер за межамі Айчыны. Дай Божа кожнаму з вас адчуваць цяпло сямейнага ачага. Усім, хто ў гэтыя дні знаходзіцца ўдалечыні ад сваіх блізкіх і родных, нагадваю словы Гасподнія: Дух дыхае, дзе хоча. Мы можам заклікаць Яго ў любым месцы і ў любы час. Бог стаў чалавекам, каб чалавек стаў богам. Менавіта Дух усынаўляе нас Нябеснаму Айцу. А гэта значыць, што кожны чалавек можа ўвайсці ў адзінства Святой Троіцы, па вобразу Якой мы створаны.

Са святам, дарагія браты і сёстры, з Раджджаством Хрыстовым!

Мітрапаліт Філарэт,
ганаровы Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі.

АКТУАЛИИ



Светлана КАЛИНКИНА

С Новым годом!

У моих знакомых родилась дочка. Люди они не самые бедные, на государственные пеленки не претендуют. Но для крохотного ребенка опасна любая инфекция, поэтому родители вынуждены соглашаться на больничный инвентарь. Например, на "казенные" пеленки, простынки, салфетки и тому подобное. И не потому, что хотят что-то урвать у государства. Однако выпаренные и продезинфицированные по всем правилам, в первые дни жизни малыша эти вещи просто необходимы.

К врачам претензий нет; и у девочки, и у мамы, слава Богу, все прекрасно. Но она в шоке. *"Я никогда не думала, что наше здравоохранение — это такое убожество! "Казенные" пеленки-простынки в пятнах, в разводах, от старости ткань просто светится и расползается под руками. Такое ощущение, что меня саму в свое время в эти же пеленки заворачивали. И это в родильном доме европейской столицы!"*

Другая история.

...У коллеги в прошлом году умер отец. Платная палата, хороший уход, но... Рак. Спасти было невозможно. Рассказывает: *"Я даже могу назвать точный день, в который возненавидела нашу власть. Это случилось в онкоцентре. Отец тогда еще был жив. Привезла ему еду, вошла в лифт, нажала на кнопку с номером этажа, приехали, открылись двери и... я увидела инвалидное кресло. Это был обыкновенный пластиковый стул, к ножкам которого проволокой прикрутили колеса от велосипеда! Это кресло стало какой-то последней каплей. Я просто сползла по стенке лифта и поняла, что я нашу власть не-на-ви-жу! XXI век... Европа... Дворцы строим... А больным людям государство не может инвалидные кресла купить..."*

Могу рассказать третью историю — о том, как наше государство отказалось лечить больных гепатитом С и тем самым многих из них обрекло на смерть. Это ведь очень экономно — списать все случаи гепатита С на наркоманию! Хотя пути заражения вирусом самые разные — это и пирсинг, и татуировки, и маникюр, и переливание крови, и от матери — ребенку... В прошлом году через интернет средства на лечение гепатита С собирал врач-травматолог из Гомеля. Он, сам врач, не мог объяснить, как заразился. Но отказался умирать, начав самостоятельный сбор средств на лечение. Потому что лекарства от этой болезни есть. Просто наши чиновники, оберегая казну, не хотят их покупать, не хотят вернуть больным гепатитом С льготы по их приобретению. Так, конечно, экономнее...

Есть и четвертая история — о том, что государство жалеет деньги на закупку обезболивающих наркотических препаратов, поэтому многие белорусы умирают в страшных муках, терпят страшные боли. Настолько страшные, что Всемирная организация здравоохранения рекомендовала нашим медикам увеличить назначение наркотиков для обезболивания в... 170 раз! Те же, кто у власти, считают: зачем тратить деньги на тех, кто и так умрет?!

Могу напомнить историю пятую — как в Барановичах построили ледовый дворец, а потом выяснилось, что на самом деле в первую очередь в городской онкодиспансер надо было покупать аппарат для лучевой терапии. Потому что без него лечение невозможно, а старый аппарат не просто выработал свой ресурс, а выработал его дважды. Следом в местной городской больнице "накрылся" магнито-резонансный томограф...

Надо понимать, местные барановичские власти, а также государственные умы в Бресте и Минске, Минздрав, Совмин, президент планировали лечить больных людей катанием на коньках. Иначе ведь нельзя объяснить, почему между больницами и хоккеем они выбирали хоккей.

Можно продолжать: история шестая, двадцать шестая на эту тему... Не раз о таких примерах рассказывала и наша газета, и я лично. Но все-таки каждый раз задаюсь вопросом: "Как такое могло прийти в голову? Кому такое могло прийти в голову? Кто считает, что такое положение дел нормально?"

Людей, которые считают это нормальным, я не знаю. Ни тех, кто во власти, ни тех, кто в оппозиции, ни тех, кто вне политики — не знаю. Зато мы все знаем человека, который накануне Нового года публично объявил, что оптимизация государственных расходов начнется со здравоохранения и образования. А 31 декабря подписал закон о бюджете на нынешний год, в котором расходы на милицию и КГБ увеличены, на здравоохранение — фактически остались прежними, на образование — уменьшены. В общем, поздравил, обрадовал...

С Новым годом, конечно! Но кажется, что уже давно пора в новом году менять не только календари.


ЭКОНОМИКА

Государственный долг Беларуси увеличился почти на 14 процентов

Государственный долг Беларуси на 1 декабря 2013 года составил 146,6 трлн рублей и увеличился по сравнению с началом года на 17,8 трлн рублей, или на 13,8%. Об этом сообщил БелаПАН со ссылкой на Министерство финансов Беларуси.

Внешний государственный долг по состоянию на 1 декабря составил 12,1 млрд долларов США, увеличившись с начала года на 90,4 млн долларов США, или на 0,8% (с учетом курсовых разниц).

В 2013 году привлечены внешние государственные займы на 1 трлн 795,6 млн долларов США, в том числе 880 млн — по кредиту АКФ ЕврАзЭС; 408,3 млн — по государственному экспортному кредиту правительства РФ, предоставляемого для строительства АЭС на территории Беларуси; 378,8 млн — по кредитам банков КНР; 128,5 млн долларов США — по кредитам МБРР.



Погашение внешнего государственного долга с начала 2013 года составило 1690,4 млн долларов США, в том числе 1393,1 млн — выполнение обязательств перед МВФ по кредиту "стэнд-бай"; 150 млн — по кредитам правительства РФ; 87,2 млн — по кредитам банков КНР; 48,8 млн — по кредиту Банка экономического и социального развития Венесуэлы; 11,3 млн долларов США — по прочим внешним государственным займам.

Внутренний государственный долг по состоянию на 1 декабря 2013 года составил 33,6 трлн рублей, увеличившись с начала года на 7,7 трлн рублей, или на 29,9% (с учетом курсовых разниц).

Увеличение внутреннего государственного долга в 2013 году обусловлено размещением валютных государственных облигаций для юридических и физических лиц и снижением официального курса белорусского рубля по отношению к доллару США, сообщает Минфин.

Для справки

Государственный долг — результат финансовых заимствований государства, осуществляемых для покрытия дефицита бюджета.

Последствия накопления государственного долга — переложение налогового бремени на будущие поколения, перераспределение доходов среди населения, вытеснение (сокращение) частных инвестиций в силу выпуска государственных ценных бумаг.

ВЕДАЙ НАШЫХ!

Азаранка пачала год з перамог

Учора на тэнісным турніры ў аўстралійскім Брысбене (прызавы фонд — 1 мільён долараў) беларуска Вікторыя Азаранка перамагла швейцарку Стэфані Фогель — 6:4, 6:7 (7:9), 6:1.



Такім чынам, зараз у 1/2 фіналу Азаранка сустрэнецца з Аленай Янкавіч (Сербія). У другім паўфінале згуляюць Марыя Шарапава (Расія) — Серэна Уільямс (ЗША).

Нагадаем, што 1 студзеня Вікторыя перамагла прадстаўніцу гаспадароў турніру Кейсі Дэлаква — 6:3, 6:1.

Такім чынам, першы блін у гэтым годзе ў Азаранка камяком не атрымаўся. Паглядзім, як будзе далей.

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

ПАД ГРАДУСАМ

У нядзелю — да плюс 7 цяпла!

*Па прагнозах сінотпыкаў, **3 студзеня** надвор'е ў краіне па-ранейшаму будуць вызначаць цёплыя вільготныя паветраныя масы, якія паступаюць з паўднёвага захаду Еўропы.*

У гэты дзень чакаецца воблачнае надвор'е, у многіх раёнах пройдуць невялікія ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. Месцамі чакаецца галалёд, туман, на асобных участках дарог галалёдзіца. Тэмпература ўдзень будзе складаць -2...+3°C. Атмасферны ціск істотна не зменіцца.

4 студзеня на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя ападкі (дождж, мокры снег). Месцамі чакаецца туман, слабы галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпэратура паветра ноччу складзе -3...+3°C, дзённы максімум дасягне 0...+5°C.

У нядзелю, **5 студзеня**, ноччу месцамі, а днём на большай частцы тэрыторыі краіны чакаюцца кароткачасовыя ападкі ў выглядзе дажджу і мокрага снегу. У асобных раёнах магчымы туман, слабы галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ноччу -3...+3°C, днём 0...+5°C, па паўднёвым захадзе месцамі да +7°C.

На пачатку наступнага тыдня рэзкіх змяненняў у характары атмасферных працэсаў не адбудзецца.

Глыбокі і магутны атлантычны цыклон, які атабарыцца паблізу паўночнага ўзбярэжжа Брытанскіх астравоў, пачне выносіць цяпло з Атлантыкі, Пірэнейскага паўвострава і даставіць яго на тэрыторыю Беларусі.

Ападкі будуць у асноўным у выглядзе дажджу. Таму пра санкі і лыжы на калядныя святы беларусам прыйдзецца забыцца...

МАРШРУТЫ

У Ніцу? Без праблем!

Нацыянальная авіякампанія 28 красавіка плануе адкрыць рэйс у Ніцу, а 30 красавіка — у Краснадар.

Аб гэтым паведаміў намеснік генеральнага дырэктара па маркетынгу і знешнеэканамічнай дзейнасці РУП "НАК "Белавія" **Ігар Чаргінец.**

Неабходнасць наладжвання новых маршрутаў паказаў аналіз пасажырапатоку.

"*Рашэнне пачаць палёты менавіта па гэтых напрамках аналагічна ў сваім родзе адкрыццю перад навагоднімі святамі рэйсаў у Жэневу і Вільнюс,* — дадаў Ігар Чаргінец. — *Так, Краснадар — традыцыйны летні кірунак, які злучае з курортамі краснадарскага рэгіёна, у тым ліку Анапай, Геленджыкам. У Беларусі з Краснадарскім краем цесныя эканамічныя сувязі, таму мы разлічваем, што рэйс будзе пасляховым. Таксама мы будзем працаваць над транзітам і паспрабуем перавозіць людзей з Краснадара далей у Прыбалтыку, Стакгольм і іншыя гарады Усходняй і Заходняй Еўропы*".

Што тычыцца Ніцы, якая размешчана на паўднёвым узбярэжжы Францыі, то да гэтага кірунку ёсць цікавасць з боку беларусаў. *"Акрамя таго, "Белавія" спадзяецца на сур'ёзны транзіт — праз Мінск пасажыры могуць, да прыкладу, ляцець далей у Расію і на Каўказ"*, — выказаў меркаванне Ігар Чаргінец.

НЕРУХОМАСЦЬ

120 тысяч долараў за ўчастак у Ждановічах

Вынікова прайшоў аўкцыён па продажы ў прыватную ўласнасць зямельных участкаў у Мінскім раёне. З 16 лотаў рэалізаваны 14, прычым за вельмі вялікія сумы. Самым дарагім стаў участак на вуліцы Майскай у Ждановічах, на які прэтэндавалі адразу шэсць заяўнікаў. У ходзе таргоў кошт 10 сотак узрос амаль у тры разы і склаў 1.141.246.000 рублёў, што эквівалентна 120.000 долараў!

Рэалізаваны і іншыя ўчасткі ў Ждановічах. Як паведамляе realt.onliner.by, адзін з іх прададзены амаль за 760.000.000 рублёў (80.070 долараў), другі — за 580.000.000 (62.044 долараў). У размешчанай непадалёк Ратамцы зямельныя надзелы плошчай 13—15 сотак сышлі з малатка за 210—448 мільёнаў рублёў (22.128—47.208 долараў), яшчэ вышэй узляцела цана на ўчастак у Крыжоўцы — 689.000.000 рублёў (72.628 долараў) за 9 сотак.

З-за Каляд наступны нумар "Народнай Волі" выйдзе 10 студзеня.

Народная Воля
http://www.nv-online.info
3 СТУДЗЕНЯ 2014 г.

ТРАГЕДЫЯ

“Дурдом!!!” — пад такой “шапкай” была надрукавана падборка, у якой расказвалася пра дзікунства слуцкіх улад, якія мала таго, што беспадстаўна разагналі ўдзельнікаў сустрэчы ў Казловіцкім Доме культуры падчас прагляду гістарычнага фільма і абмеркавання пытанняў краязнаўчага характару, дык яшчэ асудзілі ініцыятарку культурніцкага мерапрыемства, наладзілі допыт людзей, якім далёка за семдзясят. Ад узрушэнняў і згубіў прытомнасць Мікалай Цімафеевіч Люшня. Знаходзячыся ў бальніцы, ён так і не выйшаў з комы. Днямі гэтага цудоўнага чалавека пахавалі.
Аб ім — расказ слуцкай актывісткі Зінаіды ЦІМОШЫК.

Ён быў сапраўдным мужыком

*Слуцкія грамадскія актывісты смуткуюць з прычыны смерці случчаніна **Мікалая Цімафеевіча Люшні**, удзельніка кінапаказу пра Слуцкае паўстанне, і выказваюць спачуванне яго родным і блізкім.*
Мікалай Цімафеевіч пражыў 76 гадоў...

— Бацька быў родам з Украіны, нарадзіўся 15 студзеня 1937 года ў вёсцы Навая-Каўлеўка Арэхаўскага раёна Запарожскай вобласці, — расказала “Народнай Волі” дачка Мікалая Цімафеевіча Ірына. — *Ягоны бацька, каваль Цімафей Нікіфаравіч, загінуў у 1941 годзе. У сям’і было пяцёра дзяцей: чатыры браты і сястра. Па расказах бацькі, сям’я была дружная і працавітая. Старэйшы брат Міхаіл таксама быў на фронце. Мікалай Цімафеевіч успамінаў, што без бацькі было нялёгка. Не было каму заступіцца...*

Вучыўся ён у школе добра, быў схільны да матэматыкі, чарчэння. Вельмі любіў чытаць, хаця чытаць прыходзілася ў поцемках, пры лучыне. Вольнага часу было няшмат.

Вайсковую службу праходзіў у Слуцку, тут і застаўся з-за каханай дзяўчыны. Вольга і стала яго адзінай жанчынай на ўсё жыццё. Тут, у Слуцку, у 1960-х пабудаваў драўляную хату на вуліцы Якуба Коласа, дзе і пражыў да канца сваіх дзён. Скончыў Жыровіцкі тэхнікум механізацыі сельскай гаспадаркі, у розныя гады займаў розныя пасады. Працаваў галоўным інжынерам у лясгасе, начальнікам атрада аўтакамбіната №2, інжынерам на аўтабазе. Ужо будучы на пенсіі, доўгі час падпрацоўваў: не любіў сядзець без справы, ды і трэба было дапамагаць — спачатку дзецям, а пасля ўнукам.

Быў веруючым чалавекам. Сваю першую пенсію пералічыў на будаўніцтва Свята-Міхайлаўскай царквы ў Чырвонай Слабадзе.

Любоў да чытання захаваў праз усё жыццё. Любімыя паэты і пісьменнікі: Шаўчэнка, Колас, Някрасаў, Багдановіч. Знайшла ў яго паперах лісток з вершам Сяргея Грахоўскага: “Чалавеку патрэбна”. Там былі падкрэслены такія радкі:

Чалавеку не трэба спагады, —
Дабрата чалавеку патрэбна,
Каб, мінаючы прорвы і спады,
Узбірацца на стромкія грэбні,

Каб сяброў сустракаў клапатлівых
На дарогах, далёкіх ад дому,
І каб сам быў заўсёды шчаслівы,
Калі шчасце прыносіш другому.

Дачка Ірына, ведаючы яго любоў да Тараса Шаўчэнкі, у бальніцы чытала ўжо нерухомаму Мікалаю Цімафеевічу паэмы вялікага Кабзара.

Пра ягоную дабрыню і спагаду на пахаванні гаварылі і знаёмыя, і суседзі. Ён заўсёды быў гатовы дапамагаць людзям.

“*Магу распавесці пра адзін выпадак з ягонага жыцця*, — гаворыць Ірына. — *Неяк пайшоў ён за хлебам і ля хлебнай крамы ўбачыў маладога збялеўшага хлопца, якому стала дрэнна. Спыніліся каля хлопца толькі ён і адна жанчына. Дачакаўся “хуткай дапамогі”, вярнуўся дамоў, узяў грошы і паехаў у бальніцу. Аказалася, што хлопец — сірата. Пасля аперацыі (хлопцу выразалі апендыцыт) наведваў яго ў бальніцы, дапамагаў матэрыяльна, а пасля падтрымліваў адносіны, дапамог у афармленні кватэры”.*

Украінец па нацыянальнасці, Мікалай Цімафеевіч паважаў і любіў беларускую мову і гісторыю. Ён жыў у Слуцку на вуліцы Якуба Коласа, якая з 2006 года знаходзілася ў аварыйным становішчы. Восенню 2006 года вуліцу раскапалі для правядзення газаправода, райвыканкам сабраў з людзей грошы на добраўпарадкаванне і аформіў іх як ахвяраванні на суботнік (па 465 тысяч беларускіх рублёў, якія складалі ў тыя часы прыкладна 300 долараў).

У жніўні 2013 года пажылы чалавек звярнуўся ў грамадскую прыёмную кампаніі “Гавары праўду!”, сабраў 33 подпісы з жыхароў пад зваротам, дабіўся пачатку добраўпарадкавання. Дарэчы, дабіцца гэтага было нялёгка нават пасля накіравання калектыўнага ліста ў райвыканкам. Пачалі завозіць пясок і засыпаць ямы толькі пасля звароту ў пракуратуру.

Мікалай Цімафеевіч не раз абураўся з прычыны зняважлівага стаўлення слуцкага начальства да памяці беларускага пісьменніка, у гонар якога названа вуліца.

Цікавіўся гісторыяй Случчыны, марыў пра ажыўленне дзейнасці ГА “Таварыства беларускай мовы” ў Слуцку. Браў удзел у кіналекторыі, прысвечаным памяці Слуцкага паўстання 23 лістапада 2013 года. Падчас апытвання міліцыянтамі трымаўся вельмі годна, выказваў абурэнне з нагоды міліцэйскага налёту на культурнае мірнае мерапрыемства, спрабаваў абудзіць у міліцыянтах пачуццё сораму за іх учынак.



Пасля быў адным з васьмі падпісантаў індывідуальных заяў да Слуцкага пракурора, складзеных пры дапамозе праваабаронцаў, з просьбай пакараць вінаватых у парушэнні правоў грамадзян. Быў і сярод тых дзесяці чалавек, якія прыйшлі ў суд 12 снежня мінулага года і настойвалі, каб суд не прайшоў без майго ўдзелу. Мікалай Цімафеевіч хацеў выступіць сведкам на судзе, але не паспеў. У апошняй гутарцы перад пачаткам суда сказаў, што вельмі хацеў бы зазірнуць у вочы суддзі і сказаць ёй, што гэтая справа зганьбіць не толькі міліцыю, але і Слуцкі суд...

У маіх вушах дагэтуль гучыць ягоны голас:

— Вячаславаўна, вы не вельмі занятыя? Хачу расказаць пра Украіну.

Я супраціўлялася: маўляў, толькі што глядзела навіны ў інтэрнэце, усё ведаю, — а ў адказ чула:

— Я вам лепей за інтэрнэт раскажу...

І я слухала, згаджалася з усім, што ён гаварыў. Бо гаварыў ён вельмі разумна, валодаў уменнем глыбока аналізаваць і шмат ведаў такіх рэчаў, аб якіх я ніколі не чула.

У адзін з лістападаўскіх дзён Мікалай Цімафеевіч патэлефанаваў мне і сказаў, што напіша пісьмо **Алегу Трусаву**, у якім выкладзе свае погляды на метады “ажыўлення” дзейнасці ТБМ у Слуцку. На жаль, таксама не паспеў.

На пахаванні Мікалая Люшні было шмат людзей. Суседзі, знаёмыя адгукаліся аб ім як аб вельмі светлым і добрым чалавеку. Ён стараўся ўсім дапамагчы, ніколі ні з кім не сварыўся. Пенсіянер **Пётр Марчанка**, які некалі працаваў шафёрам пад яго кіраўніцтвам, сказаў пра Люшню: ***“Ён быў сапраўдным мужыком”.*** Тое ж самае паўтарыў і **Валянцін Пляўко**, які таксама працаваў некалі разам з Мікалаем Цімафеевічам. Так сталася, што пажылыя мужчыны доўгі час не бачыліся і сустрэліся ў Казловіцкім Доме культуры падчас нешчаслівага кінапаказу...


Такіх людзей, як Мікалай Люшня, у Слуцку няшмат.

Дарэчы, падчас налёту міліцыянтаў на Казловіцкі Дом культуры я ледзьве не на каленях прасіла начальніка аховы правапарадку Слуцкага РАУС Дзмітрыя Шкляроўскага не чапаць, не весці допытаў пенсіянераў, якім больш за 70 гадоў, паколькі гэта магло прывесці да пагаршэння іхняга стану здароўя.

Як у ваду глядзела...

Зінаіда ЦІМОШЫК.

г.Слуцк.





КАДРЫ

З крэсла ў крэсла

Аб’яднанне ў адну структуру Вярхоўнага суда і Вышэйшага Гаспадарчага суда пакуль азнаменавалася кадравымі зменамі.

Аляксандр Лукашэнка падпісаў указ, згодна з якім былы першы намеснік старшыні ВГС **Васіль Дземідовіч** прызначаны намеснікам старшыні Вярхоўнага суда. Адначасова ён уключаны ў склад прэзідыума Вярхоўнага суда.

Юрысты сцвярджаюць, што бліжэйшымі днямі трэба чакаць новых кадравых рашэнняў па судовай сістэме, паколькі на пачатак года ніякай яснасці ў гэтым сэнсе нават у саміх суддзяў не было.

Нагадаем, што аб’яднанне судоў адбылося з 1 студзеня 2014 года.

ТЭНДЭНЦЫІ

Беларусы губляюць аптымізм?

У чацвёртым квартале мінулага года павялічылася колькасць беларусаў, матэрыяльнае становішча якіх пагоршылася.

Пра гэта сведчаць вынікі нацыянальнага апытання, якое правёў зарэгістраваны ў Вільнюсе Незалежны інстытут сацыяльна-эканамічных і палітычных даследаванняў у снежні.

Паводле апытання, праведзенага ў верасні, матэрыяльнае становішча палепшылася ў 11,6% беларусаў, пагоршылася — у 21,6%. А ў снежні паляпшэнне матэрыяльнага становішча адзначылі 12,6% беларусаў, а пагаршэнне — ажно 28,4%.

Нягледзячы на тое, што за квартал рэальныя даходы насельніцтва выраслі з 310 да 325 долараў, колькасць беларусаў, якія лічаць, што эканоміка краіны знаходзіцца ў крызісе, вырасла больш як на 10% — у снежні так палічылі ажно 68,6% апытаных.

Значна знізіўся таксама ўзровень аптымізму, з якім беларусы глядзяць у будучыню: калі ў верасні 28,1% апытаных лічылі, што “сацыяльна-эканамічная сітуацыя ў Беларусі ў бліжэйшыя гады пагоршыцца”, то сёння так лічаць 35,9%, а колькасць аптымістаў знізілася з 17,5% да 12,5%.

КРЫМІНАЛ

З Балгарыі экстрадзіравалі беларуса, які шэсць гадоў быў у вышуку

Мужчына 1982 года нараджэння вышукваўся Інтэрполам за разбойны напад.

У 2007 годзе ён здзейсніў злачынствы: у раёне Даўгінаўскага тракта напаў на сваю ахвяру, жорстка збіў і адабраў мабільны тэлефон. Пасля гэтага зламыснік хаваўся на тэрыторыі розных краін, у тым ліку Іспаніі, Партугаліі, краін Афрыкі. Уцякач быў затрыманы 20 верасня памежнікамі ў Русе пры спробе перасекчы румына-балгарскую мяжу.

На пачатку снежня Міністэрства юстыцыі Балгарыі задаволіла просьбу Генеральнай пракуратуры Беларусі аб выдачы, інфармуе БелаПАН.

НЕЗАВИСИМАЯ ЭКСПЕРТИЗА

Борис ЖЕЛИБА, профессор, доктор экономических наук

Кремлевский отжим

Александр Лукашенко еще раз доказал, что он самый эффективный менеджер в белорусской власти. Его визиты в Сочи и Москву на заседание Высшего госсовета Союзного государства завершились долгожданным и как бы спасительным результатом. В.Путин дает Беларуси взаймы до 2 миллиардов долларов. Да и как не дать, когда Украине, чтобы только сбить накал политических страстей, которые бушуют на Евромайдане в Киеве, отвалили 15 миллиардов долларов.

Конечно, всего 2 миллиарда долларов не решат проблем белорусской экономики. Это очередной допинг, который позволяет отодвинуть угрозу обвальной девальвации белорусского рубля и все, что с этим может быть связано, на несколько месяцев. Тем более что Антикризисный фонд задержал выдачу последнего транша своего кредита до третьего квартала наступившего года. Мотивируя это тем, что не выполнено большинство показателей, которыми обставлялись условия этого заимствования: по размерам денежно-кредитной эмиссии, по приватизации, по уровню возмещения населения стоимости услуг ЖКХ и общественного транспорта и т.д.

Действительно, итоги прошедшего 2013 года — более чем неутешительные. Провалены показатели по росту ВВП, по инфляции, по привлечению иностранных инвестиций. Все те же дисбалансы во внешней торговле, между производительностью труда и зарплатой. Затоваривание складов предприятий, безмерные государственные расходы, задавленный частный сектор. Неурядицы на мировых рынках, на которые привычно ссылаются правительственные чиновники, во многом надуманы. Если рост ВВП Беларуси различает только Белстат в районе одного процента, то в Китае за истекший год рост экономики ожидается 7,5%, в США — 4,1%, Германии — более 3%. В среднем рост мировой экономики в 2013 году составит более 4%.

А что же будет с белорусской экономикой дальше? Выдавая спасительные кредиты, посадив Беларусь на энергетическую иглу в виде дешевых нефти и газа, Кремль сознательно консервирует ситуацию в виде отжившей свой век белорусской экономической модели, чтобы отжать все наиболее значимые белорусские промышленные активы. Уже нет со стороны белорусских властей возражений по созданию холдинга путем объединения активов МАЗа и КамАЗа, в распоряжение российского оборонного промышленного комплекса поступает МЗКТ, чему совсем недавно публично противился А.Лукашенко. Решается вопрос с переходом в полную собственность россиян Мозырского НПЗ. Не за горами создание других российско-белорусских холдинговых пар, в том числе с “Гродно Азот”, с “Интегралом”. Причем российские партнеры в этих холдингах значительно более мощные во всех отношениях. Это позволяет ряду экспертов заявлять о реальном грядущем поглощении белорусских активов россиянами. Показательно, что нефтяной баланс с россиянами подписан не на весь 2014 год, а на полугодие. Скорее всего, кредит в 2 миллиарда долларов также будет выдаваться траншами. Москва, как и прежде, будет держать руководство Беларуси на “коротком поводке”, чтобы не обмануться, как это бывало, в показной сговорчивости Минска и, чуть что, быстро перекрыть живительный источник.

Еще накануне Нового года Минфин заявлял о 3,2 миллиарда долларов, которые Беларуси предстоит выплатить по внешним долгам в нынешнем году. Однако М.Мясникович озвучил другие цифры: затраты по обслуживанию и выплате долгов составят 3,6 миллиарда долларов. Эксперты задаются вопросом: откуда и когда взялись еще 400 миллионов долларов долга? Мутным остается и вопрос, расплатилась ли Беларусь за поставки венесуэльской нефти. Так или иначе, по-любому долгов возвращать придется еще больше, чем в прошлом году. Поступлений от текущего экспорта на эти цели явно не хватит, значит, придется и дальше продавать активы россиянам. Параллельно Минфин намерен продолжать привлекать внешние и внутренние валютные займы путем размещения своих облигаций. Намечено перекредитоваться на сумму не менее 1,5 миллиарда долларов. Облигации, как известно, придется в скором времени погашать, но государственная финансовая пирамида продолжает строиться. В этом свете очень подозрительным выглядит недавнее заявление М.Мясниковича об ужесточении валютного законодательства в Беларуси. По его словам, “оно слишком либерально”. Это высказывание наводит на размышления.

Нетрудно предвидеть, что наступивший год не сулит белорусам ничего хорошего. Будут развиваться негативные тенденции, которые уже проявили себя в ушедшем году: болеть стало невыгодно, образование станет еще более дорогим, будут сокращаться объемы социальной помощи и перечни льготируемых лекарств, бесплатное здравоохранение станет еще более дорогим, вырастут налоги и пошлины. Спасти Беларусь может только государство с эффективно работающей самодостаточной экономикой. В котором граждане могут обеспечивать себе достойный уровень жизни и платить требуемые налоги. Государство не должно “кормить народ”, содержать своих граждан. Оно должно создать соответствующие условия для их плодотворного труда. Наступивший 2014 год точно таким не станет. Полученный очередной российский кредит не спасительный, а губительный! Он еще больше усугубляет положение дел в белорусской экономике, которая продолжает жить не по средствам, окончательно загоняет белорусов в долговую ловушку, из которой, возможно, не будет выхода и нашим потомкам.

СІТУАЦЫЯ

Далікатэсная рыба не даплыве да беларусаў?

Прадпрымальнік з Навагрудчыны не можа знайсці спажыўцоў на фарэль беларускай вытворчасці.

Прадпрымальнік **Уладзімір Маркаран** амаль дзесяць гадоў прысвяціў таму, каб арганізаваць на Навагрудчыне работу фермы па вырошчванні элітнай фарэлі. Нарэшце надышоў час, калі рыбу можна прадаваць, але бізнесмен сутыкнуўся з нечаканай непрыемнасцю — суперкарысную рыбу не жадаюць набываць. Прадпрымальнік распавёў *grodnonews.by*, што галоўная праблема ў дастаўцы. Рыбу трэба давезці да крамаў жывой, а гэта вельмі складана — фарэль гіне ад любых неспрыяльных умоў. Нават карміць яе трэба строга 12 разоў на дзень! Уладзімір Маркаран мае ўласную цыстэрну, у якой можна транспарціраваць 25 кілаграмаў рыбы, але гэты аб’ём проста мізэрны ў маштабе гаспадаркі. Каб пастаўкі акупаліся, перавозіць за раз трэба не менш за сто кілаграмаў прадукцыі. А такіх цыстэрнаў у звычайных крамах няма.

Пакуль толькі адна гандлёвая сетка з Гродна зацікавілася прадукцыяй рыбнай фермы. Пры гэтым прадукцыя Маркарана танней замежных аналагаў.

Марыя БУДНІК.

ПРИЯТНОГО АППЕТИТА!

Самая лучшая еда — не омары и икра!

Где в Беларуси можно купить органические продукты? И много ли у нас фермерских хозяйств, которые занимаются исключительно органикой? В этом вопросе разбиралась “Народная Воля”.

Несертифицированные козы

Фермерских хозяйств в нашей стране немного, а тех, что продвигают экологическое направление, и того меньше.

“*Дела с фермерскими хозяйствами обстоят не очень хорошо*, — высказала свою точку зрения “Народной Воле” кандидат сельскохозяйственных наук **Светлана Семенас.** — *Нам нужно внимательнее присмотреться к другим странам. У них уже все хорошо налажено. Для того, чтобы так же было у нас, нужно обязательно поработать с законодательством. Фермеры жалуются на отсутствие финансовой поддержки, что очень сложно брать кредиты — огромные проценты. А у органических фермерских хозяйств проблем еще больше, ведь им нужно покупать сертификаты. Сейчас у нас, кстати, в переходном периоде между обычным фермерским хозяйством и органическим находится всего 8 хозяйств”.*

Одно их этих восьми хозяйств располагается в Дзержинском районе. Ферма **Дмитрия Крылова** под названием “Дак” занимается козьим молоком, а сейчас стала единственной в Беларуси, выпускающей козий сыр. Заниматься сельским предпринимательством Дмитрий начал с 10 гектаров земли еще в 1992 году. Сейчас у него 100 гектаров и 360 коз. По подсчетам хозяина фермы, в следующем году у него должно быть уже 600 коз. В год его ферма приносит 120 тонн молока, и почти все оно уходит на заводы.

На органическое хозяйство Дмитрий перешел всего три года назад, когда случайно столкнулся с программой “BERAS”, которая занимается спасением Балтийского моря и выступает за развитие органического хозяйства. Будучи хорошим предпринимателем, Крылов сразу понял, что конкурентов у него в Беларуси не будет.


“Во-первых, фермеров у нас вообще очень мало, а во-вторых, им мало знакомо, что такое экологическое земледелие, — рассказал “Народной Воле” Дмитрий. — *Сегодня они в основном занимаются овощами и чем-то эксклюзивным — как правило, тем, куда государство не вмешивается, и где не нужны большие площади. Конкурировать в производстве, например, зерна или свинины с государством бесполезно. Поэтому занимаются лекарственными травами, ягодами, садами”.*

Для того чтобы стать экологическим хозяйством, нужно получить сертификаты, причем Евросоюза.

“Инспекторы у них очень строгие, все проверяют очень хорошо. Если вдруг что-то покажется подозрительным, сразу берут на анализы, — рассказывает Дмитрий. — *В течение этих трех лет мы получили сертификат только на землю, это значит, что мы не используем минеральные удобрения, разные пестициды. При этом мы еще не можем поставить знак экологического продукта на своем молоке. А ведь убытки уже несем. В будущем надеемся, что удастся сертифицировать коз и молоко. Правда, с этим у нас проблемы, потому что животным нужно давать экологическое зерно, а где его взять? Поэтому многие фермеры, сталкиваясь с такими проблемами, думают: “А зачем мне всем этим заниматься, если у меня сейчас есть свой доход?”*

Где вы взяли эти перчатки?

Кроме европейских специалистов ферму Дмитрия посещают и белорусские. *“Маленькому хозяйству очень сложно выполнять требования и нормы нашего законодательства, потому что они созданы под большие предприятия,* — рассказывает Дмитрий. — *Приходит инспектор, открывает, например, “Санитарно-эпидемиологические требования для организаций, осуществляющих производство молочных продуктов”, а там огромное количество пунктов: что у меня должна быть лаборатория, столько-то человек, расстояние от фермы до производства — 300 метров и так далее. Если все это выполнять, то никак не получается маленькое хозяйство такого семейного типа, как в Европе. У нас сразу получается серьезный завод со штатом людей. В Европе больше смотрят на то, какой ты человек, какой ты хозяин, чисто ли у тебя на той же кухне, в состоянии ли ты соблюдать гигиену, можешь ли выполнить стандарт продукции, знаешь ли рецептуру. И не важно, как у тебя там все устроено. У нас цепляются по мелочам: перчатки у тебя нитриловые или латексные? А сертификат на эти перчатки где?”.*



Пирог в подарок

Специалисты предупреждают: если на упаковке стоит надпись *“Органический продукт”,* не стоит ей безоговорочно доверять. Потому что соответствующие сертификаты получить очень сложно, а для некоторых производителей и вовсе невозможно. Да и бабушкам, которые торгуют на рынках и утверждают, что у них экологически чистые продукты и грядки никакими пестицидами не обрабатывают, тоже не стоит верить: не проверишь же!

“*К праздничному столу стоит закупиться деревенскими или фермерскими продуктами, а не магазинными, особенно если речь идет о мясе*, — советует кандидат сельскохозяйственных наук **Светлана Семенас.** — *Подпорченные плоды и овощи с пятнами и гнилью даже на небольшом участке не пригодны в пищу. Что бы ни говорили продавцы, токсины уже распространились по всему плоду, и вырезание пораженного участка не сделает продукт безопасным. Покупайте свежие, непереработанные продукты. Если не обойтись без консервов, то сделайте выбор в пользу стеклянной, а не металлической банки. И помните, что самая лучшая праздничная еда — это не омары или икра. А органические, локальные, фермерские и свежие продукты”.*

По словам Светланы, в некоторых странах (в той же Грузии) существует обычай дарить приготовленную или полуприготовленную еду (например, противень готового к выпечке трудоемкого пирога). Причем такие съедобные подарки делают не только в будние дни, но и к праздникам! Согласитесь, это гораздо экологичнее, да и практичнее, чем покупать в подарок “сувениры”, которые зачастую становятся мусором сразу после покупки...


